Урок беларускай мовы ў V класе

Тэма: Правапіс у, ў

Мэта: фарміраванне ў вучняў ўстойлівай сістэмы ведаў пра правапіс у, ў, заканамернасцей і правіл фукцыянавання арфаграфічных нормаў беларускай мовы.

Задачы:

- паўтарыць звесткі пра правапіс у, ў у спрадвечна беларускіх словах;
- удасканальваць навыкі вымаўлення і засваення правапісу у, ў у спрадвечна беларускіх словах;
- фарміраваць арфаграфічную пільнасць ў залежнасці ад выбару арфрграммы;
- развіваць лексіка-фразеалагічны запас вучняў;
- выхоўваць павагу да спадчыны роднай краіны;

Тып урока: камбінаваны ўрок

Ход урока

1. Матывацыйна-арганізацыйны этап

1.1 Арганізацыйна-псіхалагічная падхыхтоўка вучняў да работы

Добры дзень! Добрага здароўя! Прывітанне! – такія ветлівыя словы чуем кожны дзень пры сустрэчы. А раней гаварылі: “Як жывы-дужы? Як маешся? Дабрыдзень! Здароў!” Ведаць словы прывітання, падзякі, просьбы, прабачэння вельмі важна для кожнага носьбіта мовы. Таму давайце павітаемся, усміхнёмся адзін аднаму і з цудоўным настроем пачнём наш урок.

1.2 Паведамленне тэмы ўрока, мэтавызначэнне, матывацыя вучэбнай дзейнасці

Паведамленне вучня з папярэдняй падрыхтоўкай пра помнік літары, што ўстаноўлены ў Полацку ў 2003 годзе.

*Што гэта за літара? (ў)*

*Што мы павінны успомніць (правіла ўжывання ў беларускай мове літар у,ў), навучыцца рабіць на ўроку (правільна пісаць і вымаўляць у, ў)?*

*Якія славутыя людзі нарадзіліся ў Полацку? (Ф. Скарына, Е.Полацкая)*

2. Пазнавальна-аперацыйны этап

2.1 Праверка дамашняга задання

Сядзьце зручна і ўважліва паслухайце народную песню.

У вас на партах ляжаць карткі з яе тэкстам.

*Падкрэсліце, калі ласка, словы, у якіх адбываецца цеканне (1 вар.), яканне (2 вар.), дзеканне (3 вар.).*

Да разгарэлася каліна,
Дробна іскаркі ронячы.
Расплакалася дзяўчыначка,
Перад бацькам стоячы.
Сунімаў татачка, не суняў,
Большай жаласці надаў:
- Да дзіцятка маё любае!
Аддаю цябе ад сябе
У тыя людзі дзіўныя…

*Якое значэнне нясе слова суняў?*

*У якой сітуацыі можна пачуць такую песню?*

2.2 Уводзіны матэрыялу

*Звярніце ўвагу на дошку, дзе размешчаны назвы птушак. Паспрабуйце ўставіць прапушчаныя літары:*

| | |
|---|---|
| Ласта…ка | Ж…равель |
| Маліна…ка | Б…сел |
| Жа…рук | К…лік |
| А…сянка | Гл…шэц |

*Чаму у першым слупку уставілі у, а ў другім – ў?*

*Як мы можам зімой дапамагчы птушкам?*

*На якое народнае свята пеклі печыва ў выглядзе кулікоў, буслоў і жаўрукоў, а потым падкідалі яго ў неба?(Гуканне вясны)*

*Карыстаючыся правілам ў падручніку на с.62, зробім апорную схему па правапісу у, ў.*

*! Чаму гук [у] называецца складовым, а [ў]- нескладовым?*

2.3 Фарміраванне ведаў па тэме

2.3.1 Паўтарэнне правапісу ўласных назваў

*Запішыце назву нашай краіны (Рэспубліка Беларусь).*

Звярніце ўвагу, што абодва слова пішуцца з вялікай літары. Чаму ў назве нашай рэспублікі не пішацца ў?

*Паслухайце ўрывак з верша Ю.Свіркі "Твая Беларусь", выпішыце усе назвы краін, з якімі мяжуе Беларусь. Растлумачыць правапіс - з Украінай (Польшча, Украіна, Расія, Латвія, Літва).*

Мяжуе з Польшчай, Украінай,
Расіяй, Латвіяй, Літвой
Твой родны край, твая Айчына,
Жыццё тваё і гонар твой.
І ты яе запомні імя,
Як неба, сонца і зару.
Твая зямля, твая Радзіма
Названа светла: Беларусь!

Чаму "названа светла" (добразычлівыя людзі, светлыя позіркі, дабрыня, чысціня, яркія промні сонца)?

2.3.2 Лексічная работа

*Што такое антонімы?*

*Дапішыце сказы, выкарыстоўваючы антонімы, растлумачце правапіс у, ў:*

Верабей лятае, а вуж *поўзае.*

Васілёк сіні, а дзьмухавец *жоўты.*

Жэрдка тонкая, а бервяно *тоўстае.*

**Фізкультхвілінка**

*Што абазначаюць словы пяхота, артылерыя?*

Гэта роды войск, якія хутка будуць адзначаць Дзень абаронцы Айчыны.

Устаньце і пакажыце, як маршыруе пяхота?

Каб быць добрым артылерыстам, трэба мець пільны зрок.

*Сядзьце зручна, заплюшчыце вочы і намалюйце у паветры спачатку гук [у], потым [ў].*

2.3 Замацаванне матэрыялу

*Запішыце прыказку. Растлумачце, як вы яе разумееце.*

*Чаму мы тут не пішам ў?*

Хлеб - **у**сям**у** галава. (у пасля знака прыпынку і пасля зычнага гука)

Як мы павінны адносіцца да хлеба?

*Злучыце пачатак і канец выслоўя.*

*Растлумачце значэнне гэтых спалучэнняў.*

| | | |
|---|---|---|
| спіць | | во(у,ў)к ягняці |
| баіцца | | воцату выпі(у,ў)шы |
| круціцца | **ЯК** | пшаніцу прада(у,ў)шы |
| маўчыць | | (у,ў)юн на гарачай патэльні |

3. Завяршальны этап

Сённяшні ўрок пачаў тэму “Правапіс у, ў”. На наступным уроку мы звернем увагу на правапіс у, ў у іншамоўных словах.

1.1 Падвядзенне вынікаў урока. Рэфлексія

*Адгадайце загадку і ацаніце ёй сваю работу на сённяшнім уроку:*

Адзін – і сее, і будуе,

Гатуе, водзіць, рамантуе,

Працуе рупна, без прынукі

І мае залатыя рукі.

Другі – няўмелы і няўдалы,

І абыякавы, і вялы.

Яго не радуе работа,

Бо ім валодае лянота. (Працаўнік – гультай)

3.2 Інфармацыя аб дамашнім заданні

Вывучыць правіла на с. 62, выканаць практыкаванне 133.

Дадатковае заданне для матываваных вучняў: падрыхтаваць паведамленне пра культурную спадчыну, пра якую гаворыцца ў 3 сказе практыкавання 133.